ского союза молодежи Белоруссии (ЛКСМБ), была присоединена к газете «Звязда», что спасло издание от полного закрытия.

На встрече с журналистами в Дзержинске 23 февраля 2012 года министр информации О.В. Пролесковский озвучил перспективу создания издательского дома культурологической направленности «Звязда», в который войдут старейшее национальное издание – общественно-политическая газета «Звязда» и редакционно-издательское учреждение «Літаратура і мастацтва». По мнению главы ведомства, в итоге «уменьшатся экономические затраты, а у его руководителя появится больше возможностей для маневров при проведении единой издательской и редакционной политики» [3].

Просматривается перспектива создания второго издательского дома, который будет иметь общественно-политическую направленность. Выход из ситуации, сложившейся в данном сегменте медиасферы, ведомственному руководству видится в реорганизации, оптимизации и концентрации средств массовой информации. В частности, разрешение негативной ситуации министр информации видит в переходе информационной журналистики в онлайн-версии государственных изданий. Бумажные версии, по его мнению, станут площадкой для крупных журналистских форм: расследования, очерка, аналитики [4], недостаток которых в последнее десятилетие устойчиво обнаруживается белорусскими исследователями.

**Литература**


1. Интернет-адрес: http://www.mininform.gov.by/rus/smi/
2. Интернет-адрес: http://electroname.com/story/9819
3. Интернет-адрес: http://www.belta.by/ru/all_news/society/Mininformatsii-Belarusi-podderzhivaet-ideju-sozdanija-izdatelskogo-doma-Zvjazda_i_590027.html
4. Интернет-адрес: http://www.belta.by/ru/person/interview/Oleg-Proleskovskij_i_512732.html


# ВОБРАЗ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ


**Г. А. Дусь**


Сучасны літаратурны працэс – з'ява шматбаковая, у якой адначасова жывуць і спалучаюцца розныя светапогляды, тэмы, вобразы і г.д. Пры тым у адной літаратурнай (паэтычнай) прасторы суіснуюць некалькі пакаленняў са сваімі зацікаўленасцямі, думкамі, адчуваннямі. Таму досыць цікава прасачыць, ці мяняўся возраз лірычнага героя ў мужчынскай і жаночай паэзіі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў. Для параўнання былі абраны некалькі сучасных беларускіх паэтаў і паэтак для таго, каб на іх прыкладзе: а) параўнаць творчасць пісьменнікаў розных пакаленняў абодвух

палоў; б) прасачыць эвалюцыю вобраза лірычнага героя ў сучаснай беларускай паэзіі.

Вобраз лірычнага героя-мужчыны прадстаўлены ў творчасці Алеся Камоцкага і Цімура Хоміча, гераіні-жанчыны адпаведна – Наталлі Кучмель і Вальжыны Морт. Выбар менавіта гэтых аўтараў абумоўлены рэпрэзентатыўнасцю гэтых асоб як удзельнікаў сучаснага літаратурнага працэсу.

Паэзію Алеся Камоцкага сапраўды можна назваць інтымнай (калі разумець інтымнасць не як любоўную тэму, а як шчырасць і адкрытасць). З аднаго боку, лірычны герой уяўляе сабой такога адвечнага "маленькага прынца" Экзюперы: *"Месяц рушыў зорным небам, я ня ведаў, што мне трэба,і ішоў, прысьпешваючы крок"* [1, с. 161]. Ён блукае ў сваёй свядомасці, шукае адказы на адвечныя пытанні. З іншага боку, лірычнаму герою ўласціва механхолія. У гэтым выпадку "маленькі прынц" саступае месца сталаму мужчыну, які глядзіць на сусвет праз прызму жыццёвага вопыту. Менавіта праз вобраз гэтага мужчыны ў Камоцкага перадаецца лінія кахання. Каханне для героя ў першую чаргу з'ява духоўная, паяднанне двух сусветаў, больш мроя, чым рэальнасць, патрэбная яму як пачуццё для функцыянавання ў свеце рэчаў, магчымасць і падстава для чарговага пошуку. У адрозненні ад высокіх пачуццяў Камоцкага, паэзія Цімура Хоміча можа падацца штучнай, абмежанай у мастацкіх сродках, але гэта як раз і ўзмацняе індывідуальнасць паэта, надае яго творчасці прысмак сучаснасці. Вобраз лірычнага героя Хоміча не аднабаковы, як гэта можа падацца з першага погляду. Спачатку ён бачыцца маладым расчараваным рэвалюцыянерам, пазбаўленым самаіроніі, які шчыра лічыць, што большасць людзей – падонкі і лайно, чалавекам, зацікаўленым у рэалістычным аспекце жыцця, а не ў лунанні ў марах*:"Гэтае грамадзтва айцоў-класіцыстаў з той генерацыі, што яшчэ пакутавала пад акупацыяй"* [2]. Каханне ён трактуе як з'яву фізічную і хіба адзіны вядомы спасоб для атрымання асалоды ад жыцця. Але побач з гэткім рэвалюцыйна настроеным юнаком можна пабачыць і знясіленага ганьбай рамантыка. Больш за тое падаецца быццам герой старанна хавае свае эмоцыі за экспрэсіўнасцю ды агрэсіяй, а насамрэч прагне зусім іншага.

Гераіня паэзіі Наталлі Кучмель уяўляецца жанчынай з неверагоднай цікаўнасцю да жыцця, імгненных яго праяў. Яна знаходзіцца ў стане закаханасці ва ўсё, што яе атачае: людзей, прыроду, здарэнні. Менавіта дзякуючы гэткай закаханасці ўзроставыя катэгорыі не маюць значэння для лірычнай гераіні Наталлі Кучмель, для яе важней унутранае пачуванне сябе. Лірычная гераіня бачыцца як жанчына з вопытам, якая шмат стасуецца з маладымі і ўмее заставацца маладой, адчуваць, як маладыя:*"Падлетак! Вусны горкія твае і вочы, быццам лёд, што растае, брыво тугое надламанай стрэлкай – навек у сэрца мне загнаны стрэмкай"* [3, с. 38]. Пакуты, сум і боль гераіні ў большасці тэкстаў звязаныя з немагчымасцю дасягнуць асо-

бы каханка ці з разнапалярнасцю двух сусветаў: мужчынскага і жаночага. Каханак для яе – міфічны, абагулены персанаж, згадка пра мінулае.

Вальжына Морт надае сваёй лірычнай гераіні феміністычны і рэвалюцыйны светапогляды, малюе яе як жанчыну незалежную, адукаваную, прывабную як знешне, так і ўнутрана. Яе цікавяць і адначасова раздражняюць працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве. Гераіня лічыць свае меркаванне адзіна магчымым і правільным, але з-за непрыняцця яе думак соцыумам з'яўляюцца агрэсіўныя настроі. Яе словы абапіраюцца на жыццёвыя прыклады, аднак свой расповед яна наўмысна гіпербалізуе, робіць гісторыю больш грубай, чым рэчаіснасць. Мужчына ў яе жыцці механізм і інструмент, ёй цікава вывучаць яго. Яна сапраўдная эмансіпэ, феміністка, жанчына-вамп і шчыра ганарыцца гэтым. У зносінах ёю кіруе больш спартыўная цікаўнасць, чым прага незямных пачуццяў: *"Мужчыны прыходзяць, як лічбы ў календары, і потым ізноў паўтараюцца раз на месяц. Мужчыны, што бачылі дно найглыбейшых бутэлек, багі зямныя, нябесныя каралі"* [4].

Праз праведзены аналіз можна сцвярджаць, што лірычны вобраз жанчыны ў сучаснай паэзіі з "замілаванай асобы" у творчасці пакалення 50-гадовых набліжаецца да феміністкі ў творчасці 25-30-гадовых. Апрача ўвасаблення ў літаратуры пацверджанне гэтаму – змены, якія адбыліся ў паводзінах жанчын за апошнія дзесяцігоддзі, раўнапраўе, а часам і дамінаванне іх над мужчынамі. Сучасны лірычны герой мужчына ў кантрасце з былым "філосафам" робіцца знерваваным цынікам, эгаістам. Гэткі дысананс абумоўлены адначасовым існаваннем ў адной часавай і літаратурнай прасторы людзей рознага ўзросту і полу. Аб'ектыўная рэальнасць для ўсіх адна, а перажываюць яны яе па-рознаму. Можна пабачыць, што ўзрост важней за пол. Так аўтары пакалення 25-30-гадовых бліжэй адзін да аднаго, чым напрыклад дзве прадстаўніцы-паэткі рознага ўзросту. Таму агрэсія маладой жанчыны побач з лірычнасцю сталай, якая проста навучылася жыць і быць шчаслівай ці, прынамсі, быць у гармоніі, – робіцца зразумелай. Тое самае і з мужчынам: сталыя выглядаюць больш гарманічна. Адначасова з тым на светаадчуванне маладых аўтараў накладае адбітак і выхаванне, і падзеі з жыцця грамадства, якія з-за ўзросту ўспрымаюцца імі больш востра, чым сталымі паэтамі. Асноўная розніца паміж лірычнымі вобразамі двух пакаленняў у іх накіраванасці: вобразы паэтаў сталейшага пакалення раскрываюць унутраны свет аўтараў, а вобразы іх маладых калег – апісваюць рэальнасць у інтэрпрэтацыі творцаў, што зноў-такі можна абумовіць узростам.

**Літаратура**

1. *Камоцкі А.* Хада / А. Камоцкі // Наспадзяванае: вершы і песні / А. Камоцкі. Мінск: Радыёлаплюс, 2005. С. 161.

2. *Хоміч Ц.* Нічога не атрымліваецца // Нацыянальны паэтычны партал: http://vershy.ru/content/nichoga-ne-atrymlivaet/.
3. *Кучмель Н.* “Падлетак! Вусны горкія твае…” / Н. Кучмель // Імгненні / Н. Кучмель. Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. С. 38.
4. *Морт В.* Мужчыны / В. Морт // Родныя вобразы: http://rv-blr.com/vershu/view/423.

# ИНТЕРТЕКСТУАЛЬНОСТЬ В СОВРЕМЕННОМ РОССИЙСКОМ КИНЕМАТОГРАФЕ (НА ПРИМЕРЕ ФИЛЬМА Г. КОНСТАНТИНОПОЛЬСКОГО «САМКА»)

**Е. Г. Дятко**

В последнее время в российском кинематографе наблюдается тенденция, когда сценарий содержит элементы интертекста. Интертекстуальность как многомерная связь текста с другими текстами создается с помощью различных отсылок к ранее созданным текстам (или их концептам). Эти отсылки существуют в виде различных цитат, аллюзий, реминисценций и т.д. [4]. В данном случае сценарий, как и интертекст, обладает интенциональностью: создается автором не только с тем, чтобы высказать осмысление, концептуализацию каких-то явлений, но и для того, чтобы побудить зрителя к их переосмыслению, а возможно – и переоценке.

Лучше всего, когда в заглавии нет экспрессии, ведь оно в определенной степени программирует интерпретацию адресатом всего произведения и при этом обладает самостоятельностью. Тем не менее, Григорий Константинопольский дает своему фильму провокационное название «Самка». В толковом словаре С.И. Ожеговой и Н.Ю. Шведовой мы прочитаем, что самка – 1) это особь животного женского пола или 2) чрезмерно чувственная женщина. В то же время зритель вслед за автором «самку» позиционирует с главной героиней – молодой журналисткой. В последней сцене добрая и наивная девушка, когда встречается со снежным человеком (потомком Тургенева) превращается в тургеневскую героиню. Так возникает первая оппозиция, которую мы рассматриваем как сложный знак, планом содержания которого является целый мир, реальный или возможный.

Две следующие оппозиции (реальное – ирреальное, снежный человек – журналистка) организуют семантическое пространство сценария. К сфере объективной реальности относится то, что журналистка делает репортаж с места событий о снежном человеке, которого поймали охотники. Однако действиям главной героини автор противопоставляет ее мысли, когда она начинает сомневаться в том, что разговаривает со снежным человеком и произносит ключевые слова: «Все это из-за